

# ЧЫН СЬВЯТОЙ ПЯЦІДЗЕСЯТНІЦЫ (СЁМУХА)

Львоў
2007 л.Б.





Парахфія свт. Кірыла Тураўскага, г.Львоў

Перакладзены сьвятаром Сяржуком Горбікам

Дзеля служэньняў Беларускам Праваслаўнам Абрадзе

**Сьвятар:** Дабраслаўлёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

Уладару нябёсны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і Жыцьцядацелю, прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад ўсяго благога і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. (тройчы)

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе памілуй. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

**Чытальнік:** Госпадзе, памілуй. *(12 разоў)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Прыдзіце, паклонімся Ўладару нашаму Богу.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да Хрыста, Уладара нашага і Бога.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да самаго Хрыста, Уладара і Бога нашага.

## Псальма 103

Дабраславі, душа мая, Госпада! Госпадзе, Божа мой! Ты дзівосна вялікі. Ты ўбраны ў славу і ў веліч, Ты ўбіраешся



ў сьвятло, як у шаты, прасьціраеш нябёсы, як заслону, ладзіш над водамі вышынныя харомы Твае, робіш хмары Твае калясьніцаю, крочыш на крылах ветру. Ты творыш анёлаў Тваіх з духаў, слуг Тваіх - з вагню палымянага. Ты паставіў зямлю на цьвёрдых асновах: не пахісьнецца яна векавечна. Безданьню, як вопраткаю, накрыў Ты яе; на горах воды стаяць. Ад пагрозы Тваёй уцякаюць яны, ад голасу грому Твайго пабеглі яны; узыходзяць на горы, сыходзяць у даліны, на месца, якое Ты ім назначыў. Ты паклаў мяжу, якой не пяройдуць, і ня вернуцца зямлю пакрыць. Ты паслаў крыніцы ў даліны; паміж гор цякуць воды, пояць усіх зьвяроў польных; дзікія аслы спатольваюць смагу сваю. Каля іх жывуць птушкі нябесныя, з гольля падаюць галасы. Ты напойваеш горы з вышыняў Тваіх, плёнам дзеяў Тваіх зямля насычаецца. Ты росьціш быдлу траву, і зеляніну на спажытак чалавеку, каб ежу зь зямлі здабываў, і віно, якое вяселіць сэрца чалавеку, і алей, ад якога блішчыць твар ягоны, і хлеб, які мацуе сэрца чалавеку. Насычаюцца дрэвы Госпада, кедры Ліванскія, якія Ён пасадзіў; на іх гняздуюцца птушкі: яліны - пад гняздо буслам, высокія горы - сарнам; каменныя скалы - сховы зайцам. Ён стварыў месяц на азначэньне часу; сонца ведае свой захад. Ты прасьціраеш цемру, і бывае ноч: уначы бадзяюцца ўсе лясныя зьвяры; ільвы, якія рыкаюць па здабычы і просяць у Бога ежы сабе. Устае сонца, і яны зьбіраюцца і кладуцца ў свае логвішчы; выходзіць чалавек на дзеі свае і на працу сваю да вечара. Як многа дзеяў Тваіх, Госпадзе! Усё стварыў Ты мудра; зямля поўная твораў Тваіх. Гэта мора - вялікае і шырокае: там паўзуны, якім ліку няма, жывёлы малыя і вялікія; там плаваюць караблі, там гэты левіяфан, якога Ты стварыў гуляць у ім. Усе яны ад Цябе чакаюць, каб Ты даў ім ежу своечасова. Даеш ім - прымаюць; адкрываеш далоню Тваю - насычаюцца дабром; схаваеш аблічча Тваё - палохаюцца; забіраеш у іх дух - паміраюць, і ў пыл свой вяртаюцца. Пашлеш дух Твой - ствараюцца, і Ты абнаўляеш улоньне

зямлі. Хай будзе Госпаду слава навечна; хай радуецца Гасподзь дзеямі Сваімі. Паглядзіць на зямлю, і яна трасецца; дакранецца да гор, і дымяцца. Буду сьпяваць Госпаду ўсё жыцьцё маё, буду сьпяваць Богу майму, пакуль я ёсьць. Хай Яму паспрыяе песьня мая; буду радавацца ў Госпадзе. Хай зьнікнуць грэшнікі зь зямлі, і бязбожных хай болей ня будзе. Дабраславі, душа мая, Госпада!

Сонца ведае свой захад. Ты прасьціраеш цемру, і бывае ноч.

Як многа дзеяў Тваіх, Госпадзе! Усё стварыў Ты мудра; зямля поўная твораў Тваіх.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе Божа!

**Дыякан:** У спакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За спакой з нябёсаў і выратаваньня душаў нашых, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За спакой ва ўсім сусьвеце, за непахіснасьць сьвятых Боскіх цэркваў і за зьяднаньня ўсіх, Госпаду памалімся

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За сьвятыню гэтую і за ўсіх, хто з вераю, пашанаю і са страхам Боскім уваходзіць у яе, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За богалюбнага Сьвяцейшага Ўсяленскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)*, шаноўнае сьвятарства, у Хрысьце дыяканства, за ўсё духаменства і людзей Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За яго (яе) міласьць ... *(імя галавы дзяржавы)*, за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны і за ўвесь *(назва народа краіны)*, Госпаду памалімся.



**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За краіну нашу Сьвятую Беларусь і ўвесь беларускі народ наш, за вытрываласьць у веры і вернасьць свайму Беларускаму народу ды за выратаваньня ўсіх нас, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За месца гэтае, за ўсе месты і краіны, і за веруючых людзей, што жывуць у іх, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** За спрыяльнае надвор’е, багаты ўраджай пладоў зямных і за часы спакойныя, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Каб нам выратавацца ад усялякага гора, гневу, нябясьпекі і нядолі, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Памажы, ратуй, зьмілуйся і акрый нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Успомніўшы найсьвяцейшую, найчысьцейшую, найбольш дабраслаўлёную Ўладарку нашу Багародзіцу і ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, саміх сябе і дзін аднаго, і ўсё жыцьцё нашае Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Цябе, Госпадзі.

**Сьвятар:** Бо табе належыць усялякая слава, пашана і пакланеньня, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

(Пс. 140) Госпад, Цябе клічу: пачуй мяне. Пачуй мяне, Госпад!

Госпадзе, Цябе клічу: пачуй мяне; будзь уважлівы да голасу маленьня майго, калі я клічу Табе.

Пачуй мяне, Госпад.

Хай малітва мая ўзыдзе да Табе, быццам кадзіла, і ахвярай вячэрняй будзе ўздыманьне рук маіх.

Пачуй мяне, Госпад.

(Пс. 141) Вызваль з вязьніцы душу маю, каб мне дзякаваць імю Твайму.

Праведнікі вакол мяне чакаюць, калі Ты мне пакажаш спагадлівасьць Тваю.

(Пс. 129) З глыбіні клічу Цябе, Госпад: Госпад, пачуй голас мой.

Сьвяткуем Пяцідзесятніцу і прыйсьце Духа, і спаўненьня абяцаньня, і надзеі зьдзясьненьня, і таямніцу вялікую і пачэсную. Дык усклікнем: “Творца ўсіх Госпад, слава Табе!” *(два разы)*

Хай вушы Твае будуць уважлівымі да голасу маленьня майго.

Рознымі мовамі надзяліў Ты, Хрыстос, сваіх вучняў, каб на іх яны прапаведывалі Табе - несьмяротнае Слова і Бога, які дае душам нашым багацьця зьмілаваньня.

Калі памятлівы бясчынстваў нашых будзеш, Госпад, Госпад, хто здолее вытрымаць? Але ж у Табе адпушчэньня ёсьць.

Усё дае Дух Сьвяты, прароцтвы крынічыць, сьвятароў дасканалымі робіць, нявучаных навучае мудрасьці, рыбакоў ў богасловаў пераўтворвае, і яднае ўсю царкоўную супольнасьць. Адзінасутны і роўны славаю з Айцом і Сынам Суцяшальнік, слава Табе!

Дзеля імя Твайго спадзяюся на Табе, Госпад: душа мая чакае слова Твайго. Душа мая спадзяецца на Госпада.

Мы бачылі праўдзівае сьвятло, прынялі Духа нябёснага, знайшлі веру праўдзівую, пакланяемся няпадзельнае Тройцы, бо яна нас збавіць. *(два разы)*

Больш чым сьвітаньня чакае страж начы, больш чым сьвітаньня, хай Ізраіль чакае Госпада.

Праз прарокаў Ты абвясьціў нам шлях збаўленьня, і праз апосталаў зазьзяла нам, Збаўца, ласка Духа Твайго: Ты - Бог першы і апошні, і на вякі Ты - Бог наш.

Бо ў Госпада міласэрнасьць і вялікае ў Яго збаўленьня, і Ён вызваліцель Ізраіля ад усіх беззаконьняў яго.



У доме Тваім, Збаўца сусьвету, буду ў песьнях славіць Цябе і, укленчыўшы, пакланяюся Тваёй непераможнае моцы; увечары, раніцай і апоўні, і ў кожны час буду дабраслаўсяць Цябе, Госпад.

(Пс. 116) Хваліце Госпада, усе народы, слаўце Яго, усе людзі.

У доме Тваім, Госпад, мы праваслаўныя, укленчым душою і целам і ўсхвалім у сьпевах Цябе, безпачатковага Айца, і аднолькава безпачатковага Сына, і спрадвечнага Ўсясьвятога Духа, які прасьвятляе і асьвячае душы нашыя.

Бо міласэрнасьць Ягоная ўмацавалася над намі і вернасьць Госпада трывае давеку.

Тройцу сьвятую ў сьпевах усяславім, Айца і сына разам з Духам Сьвятым, бо так прапаведвалі ўсі пракрокі і апосталы разам з мучанікамі.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 8:** Прыйдзіце, людзі, паклонімся Богу ў трох асобах - Сыну з Айцом і з Духам Сьвятым. Спрадвечны Айцец родзіць спрадвечнага і роўнапасаднага Сына, і Дух сьвяты праслаўляецца ў Айцу разам з Сынам: адна моц, адна сутнасьць, адзін Бог. Яму мы пакланяемся кажучы: Сьвяты Божа, што ўсё творыш праз Сына Духам Сьвятым; Сьвяты Моцны, які даў нам пазнаць Айца, і праз якога Дух Сьвяты ў сусьвет прышоў; Сьвяты Несьмяротны, Духу Суцяшальніку, што ад Айца паходзіш і ў Сыне спачываеш, Тройца Сьвятая, слава Табе.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Уладар нябёсны, Суцяшальнік, дух праўды, Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўча, прыйдзі і пасяліся ў нас, і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашыя.

*Сьвятар і дыякан робяць Уваход.*

**Дыякан** *(ціха)***:** Госпаду памалімся.

**Сьвятар** (ціха)**:** Вечарам, раніцай і апоўдні хвалім і дабраслаўляем Цябе, дзякуем і молімся табе, Уладару ўсіх: скіруй малітву нашу, быццам кадзіла прад Табою, і ня дай ўхіліца сэрцам нашым да благіх слоў і думак; але выбаў нас ад усіх, што жадаюць улавіць душы нашы; бо вочы нашы, Госпад, Госпад, зьвёрнутыя да табе - дык не пасаром нас. Бо Табе належыцца ўсялякая слава, пашана і пакланеньне, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Дыякан:** Мудрасьць, устанце.

**Людзі:** Сьвятло лагоднае, сьвятло славы несьмяротнага Айца нябёснага, сьвятога, дабраславёнага - Ісуса Хрыста! Дажыўшы да захаду сонца і ўбачыўшы вячэрняе сьвятло, славім Айца, і Сына, і Сьвятога Духа - Бога. Дастойна ёсьць на ўсякі час чыстымі галасамі сьпяваць хвалу Тваю, Сын Боскі, што даеш жыцьцё: дзеля гэтага сусьвет славіць Цябе.

**Пракімен вялікі, тон 7:** Хто Бог вялікі, як Бог наш? Ты ёсьць Бог, што робіш цуды.

**Верш 1:** Ты паказаў паміж народамі моц Сваю.

**Верш 2:** І я вымавіў: Цяпер пачаў я, гэта зьмена правіцы Ўсявышэйшага.

**Верш 3:** Памянуў я справы Госпада, як памяну ад пачатку цуды Твае.

**Паўтор пракімена, тон 7:** Хто Бог вялікі, як Бог наш? Ты ёсьць Бог, што робіш цуды.

**Сьвятар:** Яшчэ і яшчэ, схіліўшы калені, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

*У сыботу на Вялікае вячорняй тут чытаюцца: Лікі 11:16-17; Яэль 2:21-27, 3:1-5; Эзэікэль 36:24-28.*

***Сьвятар ў алтары голасна чытае малітвы:***

**Малітва**

Усячысты, усягодны, безпачатковы, нябачны, неасяжны, нядасьледны, нязьмены, нязлобны Госпад, Ты адзіны маеш безсьмяротнасьць, Ты жывеш у сьвятле недасяжным, Ты стварыў нябёсы і зямлю, і мора, і ўсі стварэньня ў іх. З пачатку, раней чым прасіць, Ты выконваеш жаданьня. Цябе молімся і Табе просім, Уладыка чалавекалюбчы, Айца Госпада і Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, які дзеля нас, людзей, і нашага збаўленьня зышоў з нябёсаў і ўвасобіўся з Духа Сьвятога і Марыі Дзевы. Бо Ён з пачатку словамі навучаў, а пасьля і справамі паказаў, калі перацярпеў пакуты выратаваньня, даў нам, пакорлівым і грэшным і нягодным слугам Тваім, вобраз прыносіць Цябе маленьня з паклонам і каленасхіленьням за свае грахі і за людскае невуцтва. Ты сам, шматміласьцявы і чалавекалюбчы, выслухай нас, як толькі паклічам да Табе, асабліва ў гэты дзень Пяцідзесятніцы, у які Госпад наш Ісус Хрыстос, пасьля ўзьнясеньня на нябёсы і сяданьня па правую руку Табе, Бога і Айца, паслаў Сьвятога Духа на сьвятых сваіх вучняў і апосталаў, які і сышоў на кожнага з іх асобна, і напоўніліся ўсі нявычэрпнае Яго дабрыні, і размаўлялі рознымі мовамі аб Тваёй велічы, і прароцтвалі. Цяпер выслухай нас, што моляцца Табе, і памяні нас, пакорлівых і асуджаных, і вызвалі з палону душы нашыя, маючы да нас Тваю малітоўную літасьць.



Прымі нас, якія прыпадаюць да Табе і клічаць: мы награшылі. Цябе мы адданыя ад зачацьця, ад улоньня матчынага, Ты ёсьць Бог наш. Але таму, што ў маруднасьці гінуць дні нашыя, мы пазбаўлены Тваёй дапамогі, і засталіся без усялякага адказу. Але ў надзее на Тваю шчодрасьць клічам: Грахоў юнацтва нашага і невуцтва не памяні, ад таемных грахоў нашых ачысьці нас і не адкінь нас ў старасьці, калі сыдзе моц наша, не пакідай нас. Раней, чым павернемся ў зямлю, зрабі годнымі вярнуцца да Табе, і будзь уважным да нас дабразычлівасьцю і дабрынёй. Зьміры запалы нашы беззаконныя шчадротамі Тваімі. Нязлічоныя грахі нашыя супрацьстаў бяздоньням шчадротаў Тваіх. Паглядзі з вышыняў сьвятых Тваіх, Госпад, на людзей Тваіх, што прадстаяць і чакаюць ад Цябе

шматлікіх міласьцяў. Завітай да нас дабрынёю Сваёй, пазбаў нас д'ябльскага насільства. Сьцьвердзі нашае жыцьцё Тваімі сьвятымі і сьвяшчэнымі законамі. Анёла ахоўніка вернага прыстаў да людзей Тваіх. Усіх нас зьбяры ў Тваім уладарстве. Падай прабачэньня тым, якія на Табе спадзяюцца. Прабач ім і нам грахі, ачысьці нас дзеямі Сьвятога Твайго Духа, зваюй напады ворага на нас.

**Таксама далучае і гэтую малітву:**

Дабраславёны ёсьць, Госпад Уладар усётрымаючы, што асьвяціў дзень сьвятлом сонечным і ноч асьвятліў зорамі вогненымі, які нас зрабіў годнымі перайсьці даўжыню дзённую і наблізіцца да пачатку ночы. Выслухай маленьня нашае ды ўсіх людзей Тваіх і, прабачыўшы нам усі грахі вольныя і бязвольныя, прыймі вячорнія нашыя маленьня і пашлі шмат міласьці Тваёй і шчадротаў Тваіх на спадчыну Тваю. Абарані нас, нябыта твярдыняй, сьвятымі анёламі Тваімі, ўзброяй нас зброяй праўды Тваёй, агарадзі нас запаветам Тваім. Зьбярагі нас моцью Тваёй, збаў нас ад усялякай нягоды і ўсялякіх нападаў ворагаў, падай жа нам і гэты надыходзячы вечар з ноччу дасканалы, сьвяты, мірны, бязгрэшны, бязспакусьлівы і без прымараў, і усі дні жыцьця нашага, малітвамі сьвятой Богарозіцы і ўсіх сьвятых, якія ад веку Табе дагадзілі.

**Дыякан:** Памажы, ратуй, зьмілуйся і акрый нас, Божа, ласкаю Тваёй.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Успомніўшы найсьвяцейшую, найчысьцейшую, найбольш дабраслаўлёную Ўладарку нашу Богародзіцу і ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё нашае Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Табе, Госпад.

**Сьвятар:** Бо ўсялякая слава, пашана і пакланеньня належыць Цябе, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.



**Дыякан:** Скажам уе разам ад усея душы, і ад усяго мысленьня нашага, скажам.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Госпад усяўладарны, Бог бацькоў нашых, молімся Табе, выслухай нас і памілуй.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Зьмілуйся над намі, Божа, дзеля Тваёй вялікай міласьці, молімся Табе, выслухай нас і памілуй.

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

**Дыякан:** За богалюбнага Сьвяцейшага Ўсяленскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і за усіх у Хрысьце братоў і сёстраў нашых.

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

**Дыякан:** За яго (яе) міласьць ... *(імя галавы дзяржавы),* за ўрад, хрысталюбнае войска, якія сьцерагуць цэласнасьці і спакой гэтае краіны, і за ўвесь *(назва народу)* народ, і за вуратаваньня ўсіх.

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

**Дыякан:** За краіну нашу Сьвятую Беларусь і ўвесь беларускі народ наш, за вытрываласьць у веры і вернасьць свайму Беларускаму народу ды за выратаваньня ўсіх нас, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

**Дыякан:** Яшчэ молімся за прадстоячых людзей, што чакаюць ад Цябе вялікай і багатай міласьці, за тых, што робяць нам добрае, і за ўсіх праваслаўных хрысьціянаў.

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

Сьвятар: Бо міласьцявы і чалавекалюбчы Бог ёсьць, і Табе славы аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Дыякан:** Яшчэ і яшчэ, схіліўшы калені, Госпаду памалімся.

*Людзі стаюць на калені.*

**Людзі:** Госпад, памілуй. (тры разы)

**Сьвятар голасна чытае другую малітву:**

Госпад Ісус Хрыстос, Бог наш, Ты даў людзям Твой мір, яшчэ пры жыцьці і перабываючы з намі, Ты на неад'ёмную спадчыну даеш верным дар Усясьвятога Духа, а яшчэ больш яўлена сёньня, бо Ты паслаў гэтую дабрыню Тваім вучням і апосталам і іх вусны сьцьвердзіў вогненымі языкамі, якімі мы, увесь род людскі, уласнымі слыхам успрынялі богаведы ў сваёй мове, сьвятлом Духа асьвяціліся і ад падману, нябыта ад цемры, вызваліся, і, раздаваньням адчувальных і вогненых языкоў, і звышпрыроднымі дзеямі навучыліся мы веры ў Цябе, і адукаваліся, каб Цябе дабраслаўсяць з Айцом і Сьвятым Духам, у адзінай боскасьці і моцы і ўлады. Бо Ты, Ойчае зьзяньня, Ягонай сутнасьці нязьменае і непахіснае начартаньня, крыніца прымудрасьці і дабрадаці: адчыні і мне, грэшнаму, вусны і навучы мяне, як годна і аб чым трэба маліцца. Бо Ты ведаеш вялікую колькасьць грахоў маіх, але Твая добрасэрднасьць пераможа іх безліч. Бо вось я з жахам прад Табой, кінуўшы ў бяздоньня Тваёй міласьці адчай душы маёй. Кіруй жыцьцём маім Ты, які словам кіруе ўсемя тварэньнямі невымоўнай моцью прымудрасьці, ціхая прыстань гнаных бурамі. І пакажы мне шлях, па якому я пакрочу. Духа прымудрасьці Тваёй падай маім думкам, духа розуму падай маяму бязрозумью, духам страху Твайго асьвяці справы мае, і дух праўдзівы абнаві ва мне, і духам уладным сьцьвердзі няпэўныя мае думкі, каб штодзённа духам Тваім добрым да карыснага скіраваны, я быў годны выконваць запаветы Твае і заўсёды памятаваў аб Тваім слаўным прыходзе, калі будзеш судзіць нашыя справы. Не пагрэбуй тым, што я паддаюся абманам тленнымі прыгажосьцямі гэтага сусьвету, але замацуй, каб я прагнуў атрымаць будучыя скарбы. Бо ты вымавіў, Уладыка, што як хто будзь што толькі папросіць у Тваё імя, безперашкодна прыме ад Твайго праўдзівага Бога і Айца. Таму і я, грэшны, у прыход Твайго Сьвятога Духа, малю Тваю дабрыню: што толькі я прасіў, падай мне дзеля



выратаваньня. Так, Госпад, усялякай справы добрай багаты і добры падаўца, бо Ты шмат падаеш, што просім. Ты ёсьць спачувальнік і міласьцявы, што бязгрэшна зрабіўся саўдзельнікам нашага цела, Ты і схіляешся дабрасардэчна да тых, што схіляюць калені прад Табой, Ты зрабіўся і ачышчэньням грахоў нашых. Падай жа, Госпад, людзям Тваім шчадроты Твае, выслухай нас з нябёсаў сьвятых Тваіх, асьвяці нас моцбю выратавальнай дзясьніцы Тваёй, пакрой нас пакровам крылаў Тваіх, не пагрэбуй стварэньням рук Тваіх. Супраць Цябе адзінага грашым, але і Табе адзінаму служым; ня ўмеем кланяцца чужому богу, ні працягваць рукі нашыя, Уладар, да іншага бога. Прабач нам грахі і, прыняўшы нашыя каленасхілённыя маленьня, працягні да усіх нас руку дапамогі; прымі малітву ўсіх як кадзіла прыемнае, што ўсяславіць Твае ўсядобрае ўладарства.

**І дадае наступную малітву:**

Госпад, Госпад, Ты збавіў нас ад усялякай стралы, што ляціць у дзень, збаў нас і ад усялякай рэчы, што ў цемры прыходзіць. Прымі ахвяру вячэрнюю, рук нашых прынашэньня. Зрабі нас годнымі і ноч без пароку прайсьці, неспакушоных злым, і збаў нас ад усялякага неспакою і жаху, якія ад д'ябла на нас зыходзяць. Падай душам нашым памяць і думкам руплівасьць аб іспыце на страшнам і праўдзівам судзьдзе Тваім. Прыцьвяч жахам цела нашыя і зьміры іх, каб і ў бязмоўе сна адукаваліся мы суглядзеньням Тваіх правасудаў. Адымі ад нас усялякую злую прымару і похаць шкадлівую; зрабі нас у гадзіну маліві сьцьверджанымі ў веры і пасьпяховымі ў запаветах Тваіх.

**Дыякан:** Памажы, ратуй, зьмілуйся і акрый нас, Божа, ласкаю Тваёй.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Успомніўшы найсьвяцейшую, найчысьцейшую, найбольш дабраслаўлёную Ўладарку нашу Багародзіцу і

ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё нашае Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Табе, Госпад.

**Сьвятар:** Дабраваленьням і дабрынёю адзінароднага Сына Твайго, што з Ім ёсьць дабраслаўлёны, з усясьвятым і добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Чытальнік:** Дай, Госпад, у гэты вечар захавацца нам без граху. Дабраславёны Ты, Госпад, Бог бацькоў нашых, і імя Твае ўсяхвальнае і праслаўленае давеку. Амін.

Няхай міласэрнасьць Твая, Госпад, спачыне на нас, бо мы ўсклалі надзею на Табе. Дабраславёны Ты, Госпад, навучы мяне Тваіх запаветаў. Дабраслаўлёны Ты, Уладар, дай мне зразумець Твае запаветы. Дабраслаўлёны Ты, Сьвяты, адукуй мяне запаветамі Тваімі.

Міласэрнасьць Твая, Госпад, вечна трывае: не пагрэбуй творамі рух Тваіх. Цябе належыць хвала, Цябе належыць песьня, Цябе слава належыць, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Дыякан:** Яшчэ і яшчэ схіліўшы калені, Госпаду памалімся.

**Людзі:** Госпад, памілуй. *(тры разы)*

*Людзі схіляюцца на калені.*

**Сьвятар чытае трэцьцю малітву:**

Заўсёды цякучая, жыватворчая і адукацыйная крыніца, заўсёды супрысутная Айцу творчая моц, Ты, Хрыстос Бог наш, цудоўна выканаў усё неабходнае дзеля выратаваньня чалавецтва. Ты разарваў ланцугі сьмерці і разбурыў замкнёную браму аду, Ты зваяваў безьліч духаў злых, прывёўшы Сябе, заўсёды бязгрэшнага, за нас на закланьня і аддаў у ахвяру усячыстае цела, нядатыкальнае і няпрыступнае дзеля ўсялякага граху, і гэтае жахлівае і нявымоўнае сьвятой дзеяй падараваў нам вечнае жыцьцё. Ты зышоў у ад, аковы вечныя зруйнаваў і тым, хто ў цемры



быў увязьнёны, выхад паказаў, а злобнага і глыбіннага зьмея богамудрай прыладай злавіў і зьвязаў путамі цемры ў бездань і ў вагонь нязгасны, і ў цемру нябачную непераможнаю Тваёй моцью ўвязьніў, веліч прымудрасьці Ойчай зьдзясьняючы. Ты выявіўся вялікім абаронцам супраць нападаў злога і асьвяціў тых, хто сядзіць у цемры і цені сьмяротнай. Ты, славы вечнай Госпада і Айца Ўсявышэйшага ўлюблены Сын, сапраўды сутнае сьвятло ад сапраўды сутнага сьвятла, сонца праўды, выслухай нас, што моляцца Табе, і супакой душы слугаў Тваіх, раней спачылых айцоў і братоў нашых, і ўсіх родных па плоці, і ўсіх сваіх па веры, якіх памяць сёньня шануем. Бо ў Цябе ўлада над усемі і ў руцэ Тваёй трымаеш ўсі канцы зямлі, Уладар ўсётрымаючы, Бог айцоў і Госпад міласьці, Творца роду сьмяротнага і безсьмяротнага, і ўсёй чалавечай сутнасьці, створанага і зноў развязанага, жыцьця і спачыну, перабываньня тут і прадстаўленьня туды. Ты вымерваеш гады жывым і ўсталёўваеш гадзіну сьмерці. Ты зводзіш да аду і выводзіш, зьвязваш у немачы і адпускаеш у моцы, Ты сёньняшняе разумна творыш і карысна кіруеш будучым, Ты джалам сьмерці раненых ажыўляеш надзеяй уваскрошаньня. Ты сам, Уладар усіх, Бог Збаўца наш, надзея ўсіх канцоў зямлі і тых, што далёка на моры, паказаў нам у гэты апошні і вялікі збаўленьня дзень Пяцідзесятніцы таямніцу сьвятой і адзінасутнай і сусутнай і нязлітнай і нязьлітой Тройцы, і зыход і прыход сьвятога і жыватворчага Духа ў выглядзе вогненых языкоў Ты выліў на сьвятых Тваіх апосталаў і паставіў іх дабравесьнікамі праваслаўнай нашай веры, і паказаў іх спавядальнікамі і прапаведнікамі праўдзівага багаслоўся. Ты ў гэтае ўсядасканалае і выратавальнае сьвята зрабіў годна за затрыманых у аду прыймаць маленьня памілаваньня. Ты падаеш нам вялікія надзеі, якія пашлёш тым, што адышлі, вызваляеш ад скрухі, якія іх апаноўваюць, і супакойваеш. Выслухай нас, пакорных і нягодных, якія моляцца Табе, і супакой душы слугаў Тваіх, ранейшы памёрлых, у месцы

сьветлым, у месцы квітнеючам, у месцы прахалодным, дзе няма аніякай хваробы, скрухі і болі, і пасялі душы ў аселях звышгодных, і зрабі іх годнымі міру і аблягчэньня. Бо ня мёртвыя усяславяць Цябе, Госпад, і не перабываючыя ў адзе не асьмеляцца прынесьці Табе спавяданьня, толькі мы, жывыя, дабраслаўляем Цябе, і молім, і памінальныя малітвы і ахвяры прыносім Цябе за іх душы.

**Далучае сьвятар і гэтую малітву:**

Бог вялікі і вечны, сьвяты чалавекалюбчы, які зрабіў нас годнымі і ў гэтую гадзіну стаяць прад непрыступнаю Тваёй славай дзеля асьпяваньня і хваленьня цудаў Тваіх, будзь міласьцівы да нас, нягодным слугам Тваім, і падай дабрыню сэрцам, што скрухай апантаныя, каб прыносіць Цябе трысьвятое славаслаўя і ўдзячнасьць за вялікія падарункі Твае, якія Ты стварыў і заўсёды творыш дзеля нас. Памяні, Госпад, нямогласьць нашу і не згубі нас з беззаконьнямі нашымі, але зрабі вялікую міласьць пакоры нашай, каб мы, вырваўшыся з цямры грахоўнай, крочылі ў дні праўды і, апрануўшы зброю сьвятла, былі ў бясьпецы ад ўсялякіх хітрыкаў злога і адважна усяславілі за ўсё Табе, адзінага праздзівага і чалавекалюбчага Бога. Бо сапраўды гэта Твае, Уладыка ўсіх і Творца, і напраўду часовае вызваленьня твораў Тваіх ёсьць вялікая таямніца, а пасьля зьяднаньня і супакой на вякі. Тваю дабрыню ў гэтым спавядаем, у нашым выхадзе ў гэты сусьвет і зыходзе, што замацоўвае нашу надзею на ўваскрошаньня і жыцьця нятленнае, якое праз Тваю праўдзівую абяцанку атрымаем ў будучым другом прыходзе Тваем. Бо ты ёсьць і ўваскрошаньня нашага кіраўнік, і непадкупны і чалавекалюбчы судзьдзя тых, якія жылі, і Ўладар і Госпад узнагароды. Ты усяпраўдзіва злучыўся з намі ў целе і крыві, дзеля надзвычаёнага зыходу; Ты нашыя прыняў неад’ёмныя страсьці з міласэрнасьці шчадротаў, калі Ты па ўласнай воле быў спакушаны, і ў чым ты сам іскусіўся і пацярпеў, нам, спакушаемым, зрабіўся Ты самаабяцанай



дапамогай, таму та Ты прывёў нас разам у Твае бязстрасьця. Прыймі, Уладыка, мальбы і маленьня нашыя, і супакой ўсіх бацькоў кожнага з нас і маці, і братоў, і сёстраў, і дзяцей, раней спачыўшых у надзее на ўваскрошаньня і жыцьцё вечнае, і занясі душы іх і імёны ў кнігу жыцьця, на ложа Аўраама, Ісака і Якава, у краіне жывых, ва ўладарстве нябёснам, у раю асалоды, правадзімыя сьветлымі Тваімі анёламі ў сьвятую Тваю абіцель. Узьнясі і цела нашыя ў дзень, які вызначыў Ты ў Сваім сьвятым і ўсяпраўдзівам абяцаньні. Бо няма, Госпад, сьмерці дзеля слугаў Тваіх, калі зыходзіць нам з цела і да Табе, Бога нашага, прыходзіць, але перасоўвай ад сумнага да карыснага і салодкага, і супакою, і радасьці. А калі мы чымсьці і зграшылі прад Табой, міласэрны будзь да нас, і да іх, бо ніхто ня ёсьць чыстым прад Табой ад граху, нават калі толькі дзень адзін жыў, толькі Ты адзіны зьявіўся на зямлі бязгрэшны Госпад наш Ісус Хрыстос, праз якога мы ўсе спадзяемся атрымаць міласьць і адпушчэньня грахоў. Дзеля гэтага і нам, і ім, як добры і чалавекалюбчы Бог, прыслаб, адпусьці, прабач грахі нашыя, вольныя і бязвольныя, сьвядомыя і несьвядомыя, яўныя і таемныя, справай, думкай, словам, ва ўсіх нашых зваротах і рухах. І тым, што спачылі, падай волю і палёгку, а нас, якія тут ёсьць, дабраславі, канец добры і мірный падаруй нам і ўсім людзям Тваім, і адчыні нам ў страшнам і жахлівам Тваім прыходзе сэрца міласэрнае і чалавекалюбчае, і зрабі нас годнымі ўладарства Твайго.

**Дадае сьвятар і гэтую малітву:**

Бог вялікі і вышейшы, Ты адзіны маеш безсьмяротнасьць, Ты жывеш ў сьвятле нядасягальным, Ты ўсі тварэньня прымудра стварыў, Ты падзяліў пасярэдзіне сьвятло і цьму, і сонцу даў уладу дня, а месяц і зоркі ёсьць улада ночы, Ты зрабіў нас, грэшных, годнымі і ў гэты дзень прыйсьці да Табе з спавяданьням і прынесьці Табе вячорнюю службу; скіруй малітву нашую, як кадзіла, прад

Табой, чалавекалюбчы Госпад, і прымі яе, як прымаеш добрапахучасьці. Падай і нам у гэты вечар і ноч, якія надыходзяць, мір, апрані нас у зброю сьвятла, пазбаў нас ад жаху начнога і ад усялякай рэчы злой, якая прыходзіць у цемры; і падай нам сон, які падаў Ты нам дзеля супакою нямогласьці нашай, вольны ад ўсялякага падману д'ябльскага. Так, Уладыка, усіх дабротаў падавец, каб і на ложках нашых лежучы, памянулі і ноччу усясьвятое імя Твае, і каб мы навукай Тваіх запаветаў адукаваныя, у радасьці душэўнаў усталі дзеля славаслоўя дабрыні Тваёй, прыносячы малітвы і маленьня Тваёй добрасардэчнасьці, за свае грахі, і за ўсіх людзей Тваіх, якія праз малітвы усясьвятой Богародзіцы ў міласэрнасьці наведай.

**Дыякан:** Памажы, ратуй, зьмілуйся і акрый нас, Божа, ласкаю Тваёй.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Успомніўшы найсьвяцейшую, найчысьцейшую, найбольш дабраслаўлёную Ўладарку нашу Богародзіцу і ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё нашае Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Табе, Госпад.

**Дыякан:** Дапоўнім вячэрнюю малітву нашу Госпаду.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Памажы, ратуй, зьмілуйся і акрый нас, Божа, ласкаю Тваёй.

**Людзі:** Госпад, памілуй.

**Дыякан:** Каб увесь гэты вечар быў дасканалы, сьвяты, мірны і бязгрэшны, у Госпада просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.

**Дыякан:** Анёла спакою, вернага настаўніка, апекуна душ і целаў нашых у Госпада просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.

**Дыякан:** Прабачэньня і адпушчэньня грахоў і правінаў нашых у Госпада просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.



**Дыякан:** Усяго, што добрае і карыснае дзеля душ нашых, і супакою дзеля сусьвету ў Госпада просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.

**Дыякан:** Каб далейшы цяг жыцьця нашага ў супакоі і пакаяньні правесьці, у Госпада просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.

**Дыякан:** Хрысьціянскага канца жыцьця нашага, бязбольнага, бяздакорнага, спакойнага і добрага адказу на страшнам судзе Хрыстовым просім.

**Людзі:** Падай нам, Госпад.

**Дыякан:** Успомніўшы найсьвяцейшую, найчысьцейшую, найбольш дабраслаўлёную Ўладарку нашу Богародзіцу і ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё нашае Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Цябе, Госпад.

**Сьвятар:** Бо Ты добры і чалавекалюбчы Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьвятар:** Мір усім! *(Дабраслаўляючы людзей)*

**Людзі:** І твайму духу.

Дыякан: Галавы нашы прад Госпадам схілім.

**Людзі:** Цябе Госпад.

**Сьвятар** *(ціха)*: Госпад Бог наш, які нахіліў нябёсы і зышоў дзеля збаўленьня роду людзкага, глянь на слугаў Тваіх і на набытак Твой; бо вось слугі Твае схілілі галовы і сагнулі шыі свае прад Табой, страшным і чалавекалюбчым Судзьдзёю, чакаючы дапамогі не ад людзей, але спадзяючыся на Тваю міласэрнасьць і жадаючы Твайго збаўленьня. Дык ахоўвай нас паўсякчасна - і ў гэты вечар, і ў ноч, што надыходзіць - ад усялякага непрыяцеля і варожага дзеяньня, ад думак марных і благіх успамінаў.

**Сьвятар** *(голасна)*: Хай моц ўладарства Твайго, Айца, і сына, і Сьвятога Духа, будзе дабраслаўлёна і праслаўлена цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Сьпяваем сціхіру самагласную на сьціхоўны, тон 3:** Цяпер у знак усім сталі вядомы народы, бо жыды, ад якіх па плоці Хрыстос, хворыя няверьям, ад Боскай дабрыні адпалі. А мы, якія з народаў, сьвятла боскага зрабіліся годнымі і замацаваліся словамі вучняў, якія вяшчалі славу дабрадзея ўсім Бога. З імі, схіліўшы сэрцы і калені, з верай пакланімся, замацаваныя Сьвятым духам, збаўцам душ нашых.

**Верш:** Сэрца чыстае ствары ўва мне, Божа, і дух праўдзівы абнаві ў нутры маім.

**Сьпяваем сціхіру самагласную на сьціхоўны, тон 3:** Цяпер суцяшальнік Дух на ўсялякую плоць зьліўся, бо ад апосталаў распачаўшыся, ад іх па прычасьцю працягнуў верным дабрыню, і заўпэўнівае ў сваім уладаньні зыходам у вогняным выглядзе, раздаючы вучням мовы на песьнясьпеў і славу Боскую. Гэтым та ў сэрцах разумна адукаваныя, у веры зацьверджаныя Сьвятым Духам, молімся, каб выратаваліся душы нашы.

**Верш:** Не адкінь мяне ад твару Твайго, і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне.

**Сьпяваем сціхіру самагласную на сьціхоўны, тон 3:** Цяпер апосталы з вышыняў апранаюцца ўладай Хрыстовай, бо абнаўляе іх Суцяшальнік, у іх абнаўляючы сябе таямнічым абнаўленьням розуму; яны цудоўнымі і высокамоўнымі галасамі прапаведуюць шанаваньня вечную і простую і трысутную Існасьць, дабрадзея ўсіх Бога. Гэтым та, адукаваныя іх навукай, паклонімся Айцу з Сынам і Духам, молячыся за выратаваньня душаў нашых.

Уладар Нябёсны, Суцяшальнік, Дух праўды, ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўца! Прыйдзі і пасяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў Добры, душы нашыя.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 8:** Некалі, у адказ на дзёрзкі намер будовы вежы, Госпад зьмяшаў мовы. Цяпер у разнастайнасьці моваў Ён



даў пазнаць славу сваю. Тады Бог асудзіў бязбожных за грэх, а цяпер адукаваў рыбакоў Духам. Тады шматмоўе было пакараньням, а цяпер сугучнасьць моваў была адноўлена дзеля збаўленьня душаў нашых.

**Людзі:** Сёньня адпускаеш слугу Твайго, Уладыка, паводле слова Твайго, зь мірам; бо бачылі вочы мае збаўленьня Тваё, якое Ты ўгатаваў перад абліччам усіх народаў, сьвятло на асьвятленьня язычнікаў, і славу народа Твайго Ізраіля. *(Лк. 2:29-32)*

Сьвяты Божа, сьвяты моцны, сьвяты безсьмяротны, памілуй нас. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе памілуй. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

**Трапар, тон 8:** Дабраслаўлёны ёсьць, Хрыстос Бог наш, які прымудрымі рыбакоў зрабіў, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і імі злавіў сусьвеь. Чалавекалюбча, слава Табе.

**Сьвятар робіць водпуск:** Ты, які з бацькоўскага і боскага ўлоньня выйшаў, і з нябёсаў на зямлю зышоў, і прыняў усю нашую сутнасьць, і абожыў яе, а пасьля гэтага зноў на нябёсы ўзышоў, і сядзіш па правую руку Бога і Айца, Ты паслаў на сьвятых сваіх вучняў і апосталаў

боскага і сьвятога, і адзінасутнага, і адзінаслаўнага і супрысутнага Духа, і Ім адукаваў іх, а імі ўвесь сусьвет, Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае сваё Маці, сьвятых слаўных і ўсяхвальных апосталаў і ўсіх сьвятых памілуе і збавіць нас як добры і чалавекалюбчы.